## ¤ МОВА

# Да артыкула «Крывіцкі лексыкон» Ю. Пацюпы

*Паважаны спадару!*

*У «ARCHE» 3/2007 ёсьць артыкул спадара Юрага Пацюпы. Шмат слоў незразумелых, але я знайшоў 14 слоў, што ў нашым рэгіёне ўжывалі. І вось слова гібаць (hibać) у значэньні «гнуць» рэдка ўжываюць. Болей стасавалі слова «гібаць» да мэталу: цьвік згібаўся, нож згібаны. Я выпісаў усе словы, мне знаныя, каб параўнаць да тога, што «гнуць» і «гібаць» трохі інакш ужывалі ў размове.*

*Журнал «ARCHE» цікавы сваімі артыкуламі, шмат філязофіі. Наогул хочацца чытаць «ARCHE». Жадаю добрага ўсьпеху ў Вашай выдавецкай справе.*

*З павагай*
*Кастусь Верабей*

*11 чэрвеня 2007 г.*
*З.Ш.А.*

### Словы ў варыяцыях гібаць (hibać)

Абгібаць — гібаць навокал.
Агібаць — загібваць.
Адгібаць — выпрастаць загіб.
Дагібаць — бліжэй прыгібаць.
Выгібаць — гібаць, каб мела загіб.
Выгіб — мейсца, дзе ёсьць загіб.
Загібаць — просты цьвік загібаць.
Згібаць — пагібаць.
Нагібаць — многа разоў згібаць.
Надгібаць — трохі згібаць.
Паабгібваць — загібаць вокал.
Паадгібваць — усё згібанае выпрастаць.
Падгібаць — згібаць падніз.
Пагібаць — згібаць моцна.
Панагібаць — многа нагібаць.
Пазагібваць — усё загібаць.
Пазгібваць — непатрэбна згібаць.
Перагібаць — згібаць на іншы бок.
Прыгібаць — дагібаць (да сьцяны).
Разгібаць — адгібаць згібанае.
Угібаць — гібаць у сярэдзіну (беручыся зваліць з ног).
Згіб — згібанае.
Гібка — гібаецца.